# Роднае слова

штомесячны навуковы і метадычны часопіс

6/2024
(438)
чэрвень
ISSN 0234-1360

**“Памяць Вялікай Айчыннай...”**
Да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў:

- літаратура- і мовазнаўчыя даследаванні;
- метадычныя распрацоўкі;
- мастацтвазнаўчыя артыкулы;
- творы жывапісу

ШТОМЕСЯЧНЫ НАВУКОВЫ І МЕТАДЫЧНЫ ЧАСОПІС

# Роднае слова

2024/6
(438)
чэрвень

**Рэдакцыйная калегія**

доктар філалагічных навук А. Бельскі (старшыня)
доктар філалагічных навук М. Прыгодзіч (намеснік)
доктар педагагічных навук В. Зелянко (намеснік)
доктар педагагічных навук Г. Валочка
доктар мастацтвазнаўства Т. Габрусь
доктар філалагічных навук У. Гніламедаў
доктар мастацтвазнаўства В. Дадзіёмава
доктар філалагічных навук В. Іўчанкаў
доктар філалагічных навук І. Казакова
кандыдат філалагічных навук І. Капылоў
доктар гістарычных навук,
доктар архітэктуры А. Лакотка
доктар філалагічных навук А. Лукашанец
доктар філалагічных навук В. Максімовіч
доктар культуралогіі У. Мартынаў
доктар філалагічных навук В. Новак
доктар культуралогіі А. Павільч
доктар філалагічных навук В. Рагойша
доктар філалагічных навук І. Роўда
доктар філалагічных навук І. Саверчанка
доктар філалагічных навук В. Старычонак
кандыдат філалагічных навук М. Трус
доктар філалагічных навук І. Чарота
доктар філалагічных навук Т. Шамякіна

**Навуковыя кансультанты**

Р. Аладава, А. Белая, Д. Дзятко,
Л. Леванцэвіч, В. Ляшчынская,
А. Макарэвіч, З. Мельнікава, П. Міхайлаў,
В. Русілка, А. Садоўская, А. Солахаў,
А. Станкевіч, Н. Усава, Н. Шаранговіч,
І. Штэйнер, М. Яленскі

**Рэдакцыйная рада**

Р. Бабашка, А. Бадак, І. Булаўкіна,
В. Душэўская, Р. Ільіна, Г. Запартыка,
В. Кажура, А. Карлюкевіч, Л. Лазарчык,
А. Марціновіч, М. Пазнякоў, А. Панфіленка,
Т. Прадзед, С. Рачэўскі, Л. Собаль,
І. Таяноўская, В. Шніп

Пасведчанне
аб дзяржаўнай рэгістрацыі
сродку масавай інфармацыі
№ 561 ад 20.07.2009,
выдадзенае
Міністэрствам інфармацыі
Рэспублікі Беларусь

Заснавальнікі:
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь,
грамадскае аб'яднанне
"Саюз пісьменнікаў
Беларусі"

Часопіс выходзіць
з 1988 года
(у 1988–1991,
№ 1–48,
выдаваўся пад назвай
**"Беларуская мова
і літаратура ў школе"**)

Галоўны рэдактар

**Наталля Мікалаеўна
ШАПРАН**

АіВ
АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ
ВЫДАВЕЦТВА

ROD-SLOVA.BY

НАВУКОВАЯ БІБЛІЯТЭКА
ЧЫТАЛЬНАЯ ЗАЛА
ГрДУ імя Я. Купалы

Часопіс уключаны ў Пералік навуковых выданняў ВАК Рэспублікі Беларусь
для друкавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па філалагічных навуках,
мастацтвазнаўстве, культуралогіі, педагагічных навуках
(тэорыя і методыка навучання беларускай мове і літаратуры)

# Змест


**“ПАМЯЦЬ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ...”**
**Да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў**

**Навасельцава Ганна.** Мастацкае асэнсаванне каштоўнасці чалавечага жыцця і воінскага абавязку ў беларускім ваенным рамане ........ 3

**Сычова Святлана.** Чалавек на вайне ў творах Васіля Быкава ........ 7

**Мельнікава Анжэла.** Васіль Быкаў як філосаф ........ 10

**Старычонак Васіль.** Лексіка-семантычнае поле вайны ў беларускім мастацкім дыскурсе ........ 12

**Сяліцкая Наталля.** “Гэта не вялікая, а найвялікшая Перамога!”: Вайна ў творчасці Мая Данцыга ........ 16

**Федарэц Яна, Лашыцкі Алег.** Мастачка і партызанка Соф’я Лі ........ 20

**Карнялюк Віталь.** Гродна Васіля Быкава: штрыхі да экскурсіі ........ 24

**Навумчык Мікалай.** Комплексныя заданні па беларускай літаратуры. *Заканчэнне* [аповесць “Знак бяды” В. Быкава] ........ 27

**Казлоўская Ірэна.** “Пароль... чуласці і рашучасці... Беларусі”: Літаратурная гасцёўня да 100-годдзя Васіля Быкава (IX–XI класы) ........ 31

**Лойша Таццяна.** Гульня-віктарына па творчасці Васіля Быкава (XI клас) ........ 35

**ДА 190-ГОДДЗЯ КАНСТАНЦІНА ВЕРАНІЦЫНА**

**Кошман Павел.** “Тарас на Парнасе” ў літаратурным наратыве беларускасці XIX ст. ........ 37

**Брыль Антон Францішак.** Канстанцін Вераніцын: вядомае і невядомае ........ 41

**Мартысевіч Марыя.** “Тарас на Парнасе” і “Сказ пра Лысую гару”: дзве вяршыні бурлескна-травесційнай паэмы ў беларускай літаратуры Новага часу ........ 43

**Шамякіна Марыя.** Паэма “Тарас на Парнасе” Канстанціна Вераніцына ў кантэксце фантастычнай літаратуры ........ 48

**Навумчык Мікалай.** Комплекснае заданне па беларускай літаратуры: Паэма “Тарас на Парнасе” Канстанціна Вераніцына (IX клас) ........ 52

**Петрашкевіч Марына.** “На Парнас узлезшы...”: Інтэлектуальная гульня ........ 55

**ЛІТАРАТУРА І ЧАС**

**Ляшэнка Ангеліна.** “Пісьменнік будуе словам тое, што мастак будуе колерам”: Наватарства празаіка і жывапісца Віктара Карамазава ........ 59

**Мурзіч Эльвіра.** Белетрыстычная фабула і аўтарскае майстэрства ў апавяданнях Міхася Зарэцкага ........ 63

**Аляшкевіч Таццяна.** Мастацкі міфалагізм у творчасці Алеся Разанава ........ 66

**МОВЫ РЫСЫ НЕПАЎТОРНЫЯ**

**Кошкіна Наталля.** Унікальныя парэміялагічныя адзінкі ў беларускіх зборніках прыказак і прымавак XIX ст. ........ 69

**Бабіч Юрый.** “Элементы *каніс-кросу* і *дог-трэнінгу*”: Некаторыя асаблівасці функцыянавання англіцызмаў у сучасным беларускім публіцыстычным тэксце ........ 73

**Самуйлік Яраслаў, Дацкевіч Антон.** Гаворка вёскі Чэрск Брэсцкага раёна ........ 77

**МЕТОДЫКА І ВОПЫТ**

**Караткевіч Вячаслаў, Варановіч Валерый, Караткевіч Ірына, Шаршнёва Вольга.** Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры: III этап XL рэспубліканскай алімпіяды. 2023/24 навучальны год (IX клас) ........ 82

**Есіс Яўген, Фядзюк Юлія.** Апавяданне “Дзяльба кабанчыка” Віктара Карамазава: Сістэма ўрокаў беларускай літаратуры (VIII клас) ........ 85

**Бязручка Леанід.** Адметныя асобы чэрвеня: жыццёвы шлях і творчасць: Інтэлектуальная гульня (X–XI класы) [Віктар Карамазаў, Авяр’ян Дзеружынскі, Аляксандр Сержпутоўскі] ........ 88

**НАЦЫЯНАЛЬНАЯ І СУСВЕТНАЯ КУЛЬТУРА**

**Князева Ірына.** Дачныя задачы: Да 10-годдзя Дачы-музея Васіля Быкава ........ 91

**Шаталава Вольга.** “Дарагі Юрый Маісеевіч...”: Да 170-годдзя з дня нараджэння Юдаля Пэна ........ 93

***Каляндар памятных датаў і юбілейных дзён на 2024 год.*** Ліпень (15, 47, 62).

***Праект “100 партрэтаў Васіля Быкава: Да стагоддзя народнага пісьменніка”.*** [С. Ткачэнка, У. Вішнеўскі] (23).

***Наш каляндар.* Міхайлаў П., Цяслюк Н.** Мовазнавец і педагог Іван Козыраў (81).



У адпаведнасці з заканадаўствам аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць прыведзеных у артыкуле фактаў і звестак.
Рэдакцыя пакідае за сабой права друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.
Пры перадруку спасылка на “Роднае слова” абавязковая.
Дасылаючы матэрыялы для публікацыі ў нашым часопісе, аўтары тым самым перадаюць выдаўцу невыключныя маёмасныя правы на ўзнаўленне, распаўсюджванне, паведамленне для ўсеагульнага ведама і іншыя магчымыя спосабы выкарыстання твора без абмежавання тэрыторыі распаўсюджвання (у тым ліку ў электроннай копіі часопіса), а таксама даюць згоду на апрацоўку персанальных звестак.
Патрабаванні да афармлення матэрыялаў і ўмовы прыняцця матэрыялаў для аспірантаў гл. на сайце часопіса rod-slova.by.
Калі не пазначана іншае, то ілюстрацыйны матэрыял (фотаздымкі, графікі, табліцы, рэпрадукцыі) пададзены аўтарам / аўтарамі артыкула.
Паводле падатковага заканадаўства выдавецтва пры налічэнні ганарару падае звесткі пра даходы аўтараў незалежна ад факта атрымання грашовых сродкаў на рукі. Для таго каб ганарар не налічваўся, аўтар можа адмовіцца ад яго, прыклаўшы да матэрыялу, які дасылаецца ў рэдакцыю, заяву.
Спампаваць заяву можна на сайце часопіса.

Віталь КАРНЯЛЮК,
кандыдат гістарычных навук

# ГРОДНА ВАСІЛЯ БЫКАВА: ШТРЫХІ ДА ЭКСКУРСІІ

У сённяшняга Гродна нямала афарыстычных назваў, якія адлюстроўваюць яго гістарычныя і геаграфічныя адметнасці: *каралеўскі горад Гродна, горад Стэфана Баторыя, горад на Немане, горад каралеўскіх замкаў, горад святога Губерта…* Да іх варта дадаць яшчэ адну – *горад Васіля Быкава.* Вядома ж, на званне "горад Быкава" могуць прэтэндаваць і Віцебск, дзе ён займаўся ў мастацкай вучэльні, і сталіца Беларусі – Мінск. Аднак у Гродна, на нашу думку, ёсць найбольш падстаў насіць такое пачэснае найменне. Менавіта тут у перыяд 1947–1977 гг., з амаль шасцігадовым перапынкам на ваенную службу на Далёкім Усходзе, В. Быкаў займеў сям'ю, тут гадаваліся яго сыны Сяргей і Васіль, тут былі напісаны чатырнаццаць першых твораў, што склалі заўважную частку беларускай і сусветнай літаратуры.



**Васіль Быкаў на Замкавай гары.** Гродна, 1973 г. *Фота А. Перахода.*

Пра жыццё і дзейнасць Васіля Быкава ў Гродне можна прачытаць у яго ўспамінах [1] або ў даследаваннях Д. Бічэль, В. Жураўлёва, А. Карпюка, Б. Клейна, В. Макаравай, А. Пяткевіча, С. Шапрана [2–11]. Хоць зразумела, што комплекснае вывучэнне гродзенскага перыяду жыцця пісьменніка яшчэ наперадзе. У 2021 г. Вольга Макарава, выпускніца Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, абараніла магістарскую працу «Гісторыка-літаратурнае абгрунтаванне лакальнага турыстычнага брэнда "Гродна – горад Васіля Быкава"». Пэўныя высновы даследавання знайшлі адлюстраванне ў артыкулах [12; 13]. Сабраная і прааналізаваная біяграфічная інфармацыя гродзенскай часткі жыцця В. Быкава дазваляе гаварыць пра магчымасць стварэння паўнавартаснага тэксту адпаведнай тэматычнай экскурсіі. Немалая частка звестак пра мясціны, звязаныя з В. Быкавам у Гродне, яшчэ патрабуе ўдакладнення, а значыць – працягу архіўных і іншых гістарычных даследаванняў.

Горад на Нёмане вабіў і вабіць турыстаў як з розных куткоў нашай краіны, так і з замежжа. Прапануем агляд некаторых быкаўскіх мясцін у Гродне. Спадзяемся, што такія звесткі спатрэбяцца і педагогам, і экскурсаводам, і асобным вандроўнікам.

Традыцыйная аглядная экскурсія пачынаецца ад сцен Старога замка. Каралеўскія гродзенскія замкі прыцягвалі і ўвагу Васіля Быкава. "*Мы хадзілі па ціхіх гарадзенскіх вулічках паблізу ад двух гістарычных замкаў, і Аляксандр Трыфанавіч* [А. Кузьмін – сакратар ЦК КПБ па ідэалогіі] *ціхім голасам распавядаў пра сваю вайну, як быў на фронце лётчыкам, штурманам бамбардзіроўшчыка… З тае сустрэчы ў мяне з АТК, як яго клікалі за вочы, склаліся прыязныя, амаль таварыскія адносіны*" [1, с. 302]. У гэтых замкавых ваколіцах знаходзіцца знакамітая "лесвіца кахання". Сын пісьменніка Васіль пацвярджае, што захаваліся зробленыя тут фотаздымкі бацькі "з гасцямі – і прыезджымі, і мясцовымі пісьменнікамі" [9].

Падчас літаратурнай экскурсіі аб'ектамі паказу і расказу выступаюць не толькі дакументальна звязаныя з жыццём аўтара мясціны, пабудовы ці помнікі, але і аб'екты, якія знайшлі адлюстраванне на старонках яго твораў. У аповесці "Дажыць да світання" (яна, дарэчы, пісалася ў Гродне па адрасе вуліца Алега Кашавога, 28, цяпер вуліца Вялікая Траецкая) "лесвіца кахання" таксама згадваецца: "*Далёка ўнізе па каменных прыступках лесвіцы рухаліся маленькія фігуркі людзей, якія расходзіліся па абодва бакі*

*набярэжнай, што плаўна агінала бераг і дзесьці знікала пад густой навіссю дрэў"*. А вось радкі пра Стары замак, які ўразіў лейтэнанта Іваноўскага: "*Старажытныя, змураваныя з вялізных камянёў сцены замка, гэты цяжкі, аграмадны, перакінуты цераз каменную лесвіцу мост, вялізныя масівы зяляніны на пагорках, высачэнны, уладарны над горадам слуп гарадской каланчы паблізу, вядома, не маглі не спадабацца яму...*"

У будынку Новага замка (чарговага знакавага аб'екта кожнай экскурсіі па Гродне) у савецкі час размяшчаўся абласны камітэт кампартыі. Па вымушанай неабходнасці завітваў туды і В. Быкаў.

Яшчэ адно векапомнае месца Гродна, безумоўна, – Барыса-Глебская (Каложская) царква, якая таксама згадваецца ў аповесці "Дажыць да світання". Апроч дэталяў апісанага В. Быкавым стану перадваеннага будынка царквы мы маем факты з успамінаў пра раён Каложы, сабраныя В. Макаравай. А вось што пісаў сам Васіль Быкаў: "*У пачатку восені знайшоў кватэру ў прыватным дамку пад Каложай. Перабірацца было проста – ніякай маёмасці не мелі. Мар'я Іванаўна ў якасці пасагу дала мне кававарку. Толькі не было кавы. Жыць удвох на маю зарплату ў 930 рублёў было нялёгка. З першых дзён узніклі праблемы. Вольнага часу зусім не было, з рэдакцыі вяртаўся позна, гадзінаў у дзесяць вечара. Раніцой бег да дзевяці*" [1, с. 149]. Удакладненне гэтага адраса – наступны крок у даследаванні гарадзенскіх адрасоў пісьменніка. Зразумела, што для ўключэння ў экскурсійны маршрут па быкаўскіх мясцінах Каложа і Каложскі парк маюць усе падставы.

Берагі Нёмана і сама рака – асобнае месца ў быкаўскай прэзентацыі Гродна. Сярод розных эпізодаў згадаем звязаны з баўленнем вольнага часу. Гаворка ідзе пра катанне па Нёмане на маторнай лодцы разам з сябрамі – мастаком Валянцінам Чэкіным і доктарам Уладзімірам Калкуном. Гэтыя водныя вандроўкі ўспамінаў сам Васіль Быкаў, пра іх расказвалі сын пісьменніка Васіль («Па правы бок старога моста, дзе цяпер стаіць будынак рыбааховы, раней было месца для рэгістрацыі. Спачатку была лодка ў Чэкіна, потым бацька купіў "казанку". Памятаю, як мы яе збіралі ў двары») і дацэнт ГрДУ імя Янкі Купалы, сацыёлаг Таццяна Богуш [8]. А вось словы пра сваё захапленне самога Васіля Уладзіміравіча: «*Назаўтра раніцай паплылі ад гарадзенскіх мастоў уніз – да Пышак, паўз Мелавыя горы, Ласасянкі і далей да вусця Чорнай Ганьчы. У мяне тады быў невялічкі маторны кацярок маркі "Прагрэс", на якім я тут аб'ездзіў усё наваколле ўверх і ўніз па Нёмане*» [1, с. 368]. Мяркуем, што можна спраектаваць асобны турыстычны маршрут на адлегласці ад Гродна да Аўгустоўскага канала – "Быкаўскі шлях па Нёмане". І ў межах гродзенскай экскурсіі таксама абавязкова расказваць пра раку.

Ключавыя быкаўскія мясціны ў Гродне – месцы пражывання. Адрасоў шмат, большасць трэба ўдакладняць. Але два з іх – на вуліцы Вялікай Траецкай, 28 і Свярдлова, 18 – напоўнены падзеямі, якія дазваляюць стварыць там паўнавартасныя музеі класіка нашай літаратуры.

Маршрут традыцыйнай агляднай экскурсіі па горадзе скіраваны такім чынам, што трохпавярховы дом № 28 па вул. Вялікай Траецкай трапляе ў поле зроку. Экскурсавод раскажа, што менавіта тут былі напісаны "Альпійская балада" (1963), "Мёртвым не баліць" (1965), "Дарога дадому" (1965), "Салдацкі лёс" (1966), "Ранак-світанак" (1966), "Сваякі" (1966), "Праклятая вышыня" (1968), "Круглянскі мост" (1968), "Сцюжа" (1969), "Сотнікаў" (1970), "Абеліск" (1971), "Дажыць да світання" (1972), "Круты бераг ракі" (1972). Таксама варта згадаць пра гасцей пісьменніка. А сярод іх найперш сябры – гісторык Барыс Клейн, мастак Валянцін Чэкін, урач-неўрапатолаг Уладзімір Калкун, пісьменнік Аляксей Карпюк. Стасункі з кожным – асобныя кірункі жыцця гаспадара кватэры на Вялікай Траецкай. І асобныя старонкі гісторыі Гродна, якія пэўнымі аспектамі былі адлюстраваннем вялікіх грамадска-палітычных і культурных падзей. Каля дома № 18 па вул. Свярдлова (куды, праўда, ніколі не завітваюць аглядныя экскурсіі) можна нагадаць пра візіт Ларысы Шапіцькі, стваральніцы фільма "Узыходжанне" (паводле аповесці "Сотнікаў"). Гэтыя падзеі яшчэ памятаюць старажылы двара.

Цікавымі для экскурсантаў будуць і ўспаміны пра жыццё В. Быкава на Вялікай Траецкай. Сын пісьменніка Васіль расказваў, што бацька "умеў арганізаваць сваё працоўнае месца. У яго былі добрыя ручкі, усё акуратна ляжала... Усё было досыць кампактна – гэта ж была агульная тэрыторыя, мы там гулялі. Бацька там існаваў, як мог. Цяжка працаваць, дзе ў кватэры двое школьнікаў. Мы там жа і ўрокі рабілі. Наўрад ці яму было зручна і камфортна там працаваць. Тады час такі быў: без тапак не паходзіш (летам можна, а зімой холадна). Ацяпленне спачатку было пячное. Потым печ знеслі, паставілі газавую калонку. Жыццё паступова змянялася, мяняўся і стыль працы. З'явілася больш зручная пішучая машынка. Потым мы ўсё ж такі сталі менш праводзіць часу дома – падраслі". Вось яго згадкі пра стасункі з бацькам: "Бацька

проста даў магчымасць нам… знаходзіць нейкую асабістую справу. Мне падабалася фатаграфія ў той час. Ён мне даў свой стары фотаапарат, усё для праяўкі фота. Я гэтым і займаўся, але бацька ніколі не ўмешваўся. Ён дапамагаў, але сам у гэтым не ўдзельнічаў. Калі-небудзь мог паглядзець фатаграфіі і што-небудзь параіць" [9].

Гэтыя адрасы звязаны з яшчэ адным вектарам творчай дзейнасці пісьменніка – працай В. Быкава над сцэнарыямі фільмаў паводле яго твораў. У гродзенскі перыяд былі зняты кінастужкі "Трэцяя ракета" (1963), "Альпійская балада" (1965), "Пастка" (1966), "Жадаю ўдачы" (1968; па матывах апавядання "Чацвёртая няўдача").

Згадаем яшчэ некалькі быкаўскіх мясцін. Па маршруце агляднай экскурсіі мы мінаем былы Дом культуры тэкстыльшчыкаў, дзе ўшаноўвалі пісьменніка з нагоды яго 50-гадовага юбілею. У будынку Дома-музея Элізы Ажэшкі В. Быкаў, Б. Клейн і А. Карпюк у сярэдзіне 1960-х заснавалі Клуб вальнадумных інтэлектуалаў, там абмяркоўвалі падзеі, што адбываліся ў краіне і ў свеце. Там жа размяшчалася Гродзенскае аддзяленне Саюза пісьменнікаў, праходзілі сустрэчы як з мясцовымі літаратарамі, так і з гасцямі з іншых гарадоў Беларусі. Аляксей Пяткевіч, вядомы літаратуразнаўца і краязнаўца, успамінаў: "Было некалькі абласных нарадаў, на якія прыязджалі многія пісьменнікі і сустракаліся з маладымі гродзенскімі пісьменнікамі. Ёсць фотаздымак з апошняй нарады. Яна была самая вялікая, тады прыехала чалавек дзесяць, можа, болей. Я тады рабіў агляд літаратуры Гродзеншчыны. А пасля, калі скончылася, на ганку зрабілі агульны здымак. Наперадзе стаяць там Пестрак, Русецкі, Гілевіч, Ткачоў. Далёка ў глыбіні – Макаёнак, Быкаў і іншыя" [14].

Падчас экскурсіі нельга абмінуць і Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы. Восенню 1994 г. у актавай зале філалагічнага факультэта па адрасе вул. Леніна, 32 адбылася апошняя сустрэча студэнтаў і выкладчыкаў з пісьменнікам. Варта завітаць да будынка па вуліцы Савецкай, дзе знаходзілася цырульня "Антэй" (існавала з 1927 г.), там В. Быкаў любіў займаць месца ля акна, а цырульнікам на працягу многіх гадоў быў вядомы майстар Язэп Маяровіч. Будынак сённяшняй клінікі "Ладэ" – былы корпус "Гродзенскай праўды", дзе ветэраны прэсы пакажуць кабінет, які займаў В. Быкаў як супрацоўнік выдання. (Дарэчы, у сённяшнім будынку газеты па вул. Антонава, 25 ёсць музей з экспанатамі, прысвечанымі знакамітаму супрацоўніку.) А яшчэ ёсць кавярні і рэстараны, кінатэатр "Гродна", лесапарк Пышкі, парк імя Ж. Жылібера, ваенкамат на вуліцы 1 Мая, загарадны ваенны палігон Крынічнае, дачны пасёлак Віцькі, а таксама былое гаражнае месца ля Старога моста, дзе пісьменнік любіў важдацца з "жалязякамі" – сваімі аўтамабілямі. Да гэтага пераліку дадамо адрасы сяброў – Б. Клейна, А. Карпюка, У. Калкуна і В. Чэкіна… І ў выніку атрымліваем культурную прастору горада В. Быкава, горада, дзе талент яго жыхара нараджаў выдатныя творы беларускай літаратуры.

Як бачым, камемаратыўныя практыкі ў дачыненні да жыцця і дзейнасці Васіля Быкава ў Гродне, сярод якіх і фарміраванне прывабных экскурсійных маршрутаў, проста неабходныя.

### Спіс літаратуры


1. **Быкаў, В.** Доўгая дарога дадому : кніга ўспамінаў / В. Быкаў. – Мінск, 2004. – 544 с.
2. **Бічэль, Д.** Хадзі на мой голас : эсэ, успаміны / Д. Бічэль. – Гародня ; Wrocław, 2008. – 331 с.
3. **Журавлёв, В.** "Чем больше имя знаменито, тем неразгаданней оно…" / В. Журавлёв. – Гродно, 2020. – Кн. 4, ч. 1 : г. Гродно: Василь Быков. – 508 с.
4. **Журавлёв, В.** "Чем больше имя знаменито, тем неразгаданней оно…" / В. Журавлёв. – Гродно, 2015. – Кн. 3, ч. 1 : г. Гродно: Василь Быков. – 428 с.
5. **Карпюк, А. Н.** Развітанне з ілюзіямі : эсэ, апавяданні, дзённікі / А. Н. Карпюк. – Гародня ; Wrocław, 2008. – 408 с.
6. **Клейн, Б. С.** Недосказанное / Б. С. Клейн. – Минск, 2019. – 340 с.
7. **Клейн, Б. С.** Недосказанное. Имена / Б. С. Клейн. – Минск, 2008. – 456 с.
8. **Макарава, В**. Запіс размовы з Т. А. Богуш [Гуказапіс] / В. П. Макарава. – Гродна, 2020. – 1 дыск.
9. **Макарава, В. П.** Запіс размовы з В. В. Быкавым [Гуказапіс] / В. П. Макарава. – Гродна, 2021. – 2 дыск.
10. **Пяткевіч, А. М.** Гродна, студэнцкая аўдыторыя, калегі і інш. Ч. II / А. М. Пяткевіч // Новы замак : літаратурны альманах. – Гродна, 2021. – С. 225–242.
11. **Шапран, С.** Васіль Быкаў: гісторыя жыцця ў дакументах, публікацыях, успамінах, лістах : у 2 т. / С. Шапран. – Мінск ; Гародня, 2009. – Т. 1. – 734 с.
12. **Корнелюк, В. Г.** К проблеме нейминга как инструмента просвещения и туристической привлекательности / В. Г. Корнелюк, О. П. Макарова // Культура и взаимодействие народов в музейных, научных и образовательных процессах – важнейшие факторы стабильного развития стран Евразии : сб. науч. тр. : в 2 ч. / отв. ред.: М. Л. Бережнова, А. А. Ильина, С. Н. Корусенко. – Омск : Наука, 2021. – Ч. 1. – С. 386–392.
13. **Карнялюк, В. Р.** Гродна – горад Васіля Быкава. Як захаваць памяць славутага пісьменніка [Электронны рэсурс] / В. Р. Карнялюк, В. П. Макарава // Вечерний Гродно. – 2021. – 8 жн. – Рэжым доступу: https://vgr.by/2021/08/08/grodna-gorad-vas-lya-byikava-yak-zahavac-pamyac-slavutaga-pismennika/. – Дата доступу: 14.04.2024.
14. **Макарава, В. П.** Запіс размовы з А. М. Пяткевічам [Гуказапіс] / В. П. Макарава. – Гродна, 2020. – 3 дыск.